# РЭАНІМОВА

ЛЮТЫ 1990 ГОД · ГРОДНА


# перадвыбарны нумар Дэмакратычнага блоку Саветы-90 № 2 (8)

Раз абселі беларуса
савет і партыец
ды давай яму сваяцтвам
тыкаць па патыліцы.

-Ты мой ісьціны браточак!-
так савет лапоча.
-Ты мой хрэсьнік, мой сыночак!
партыя сакоча.

Беларус жа ім на тое:
-А браткі ж мае вы!
Смачны жолуд вам на каву,
ды высока дрэва.
Пухніце на нашым сале,
ешце і катлеты...
Паспрабуем выбраць самі
новыя Саветы.

Паводле Янкі Купалы

## ЗВАРОТ АРГКАМІТЭТУ РС ДА ГРОДЗЕНЦАЎ НА МІТЫНГУ 3.02.1990 ГОДА.

Рабочыя! Вы пазбаўлены шмат якіх правоў. Вас прыкавалі феадальнай сістэмай закона да прадпрыемстваў, вам няма як перайсьці на іншае з-за чаргі на кватэру, на садок.

Сваёй цяжкай працай вы корміце цэлую армію бескарысных справе людзей. Вас прымушаюць працаваць ва ўмовах,шкодных для здароўя вашага і вашых будучых дзяцей. А навошта кідаць сродкі на стварэньне нармальных умоў працы, калі можна даплаціць капейкі за шкоднасьць?

Прэміяльная сістэма ператворана ў скрытую форму штрафаў, якія накладаюць не толькі за парушэньні працоўнай дысцыпліны. Львіная частка прэмій выкарыстоўваецца на заахвочваньне разбухшага не ў меру апарата ўпраўленьня.

Вынікамі вашай працы распараджаюцца іншыя. Вам пакінулі права стаяць у чарзе за тымі прадуктамі вытворчасьці, у якія вы і вашы калегі кожны дзень уносіце сваю працу.

У вас самы кароткі адпачынак. Пасьля работы вам адпачываць няма дзе.

Каб забыцца пра усё, заглушыць унутраны пратэст, вам пакінута адна магчымасьць - бутылка.

Калі вы пратэстуеце па адным супроць добра арганізаванай і адпрацаванай сістэмы,вы не пераможаце.

Партдзяржапарат вас жа і вінаваціць у нізкай працоўнай дысцыпліне, свае памылкі кіраўніцтва краінай звальвае на вашы плечы.

Ідзе новае наступленьне на правы рабочых. Урад з І кастрычніка 89г. замарозіў рост зарплаты. Гэта ў першую чаргу кранула рабочых. Нельга атрымаць большае платы за больш прадуктыўную працу. Пераглядваюцца сьпісы вытворчасьцей са шкоднымі ўмовамі працы. Адным махам шкодныя ператвараюцца ў нармальныя.

Толькі аб"яднаўшыся мы зможам абараніць свае правы.Толькі стаўшы гаспадарамі прадпрыемстваў мы зможам абараніць сваіх дзяцей і вывесьці краіну з эканамічнага крызісу, устанавіць эканамічную справядлівасьць у ёй. Рабочы Саюз -- арганізацыя рабочых і для рабочых.

Мы разумеем, што прафсаюзы ня могуць, калі б і хацелі, абараніць рабочага..Нельга абараняць усіх ад усіх. Там, дзе мы бачым не пустыя словы, а рэальную абарону рабочых партыйнымі, савецкімі, прафсаюзнымі органамі, саветамі працоўных калектываў, мы за супрацоўніцтва.

Мы за супрацоўніцтва з Народным Фронтам "Адраджэньне".

Гродзенскі аргкамітэт Рабочага Саюза Беларусі - у дэмакратычным блоку "Саветы-90".

Прачніцеся! Час яшчэ чакае вас! Сярод кандыдатаў, нягледзячы на перашкоды,вылучаны людзі, здольныя змагацца за новыя Саветы.

## Аб адносінах БНФ да падзей у Арменіі і Азербайджане

Гарадзенская Рада БНФ "Адраджэньне" афіцыйна заяўляе, што Беларускі Народны Фронт у адпаведнасьці са сваім статутам зьяўляецца незалежнай грамадзкай арганізацыяй,якая ня ўжывае сілы і не адказвае сілай на сілу.

БНФ гатовы супрацоўнічаць і супрацоўнічае з усімі палітычнымі, грамадскімі і нацыянальнымі арганізацыямі, дзейнасьць якіх ня супярэчыць прынцыпам цывілізаванага грамадзтва.

Мы асуджаем праліцьцё крыві ў Азербайджане і Арменіі. Мы асуджаем любое ўжываньне зброі, сілы і пагрозаў дзеля дасягненьня сваіх палітычных мэтаў.

Мы лічым, што ў Азербайджане і Арменіі ў вырашэньні канфлікту вакол Карабаха быў згублены час, калі існавала яшчэ палітычнае выйсьце з крызісу.

На жаль, цяпер толькі армія здольная спыніць вайну паміж абодвума народамі.

Мы лічым, што ў Кампартыі, органах савецкае ўлады і Народных Франтах Азербайджана ды Арменіі дзейнічаюць карумпаваныя элементы, якія справакавалі братазабойчую вайну.

Мы лічым несумленнымі сьпекуляцыі і спробы дыскрэдытаваць дэмакратычныя рухі ў іншых рэспубліках, тых сілаў, якія баяцца дэмакратызацыі грамадзтва, баяцца актыўнасьці народу.

БНФ "Адраджэньне" патрабуе спыніць праліцьцё крыві ў Закаўказьзі.

1.02.1990


Modern History Archives
Archiŭ Najnoŭšaje Historyi
Fond ... sprava ...

# Дэмагогія з „апаратам" на шыі

## стыль пазычаны ў „Гродзенскай праўды"

Прадмова мітынга 3 лютага на стадыёне "Чырвоны Сьцяг" настолькі скандальная, што пераказ яе прыйдзецца адкласці, ашчаджаючы нервы выбаршчыкаў.

Таму бліжэй да справы.

25 студзеня Гарадская Рада БНФ "Адраджэньне" накіравала у канцылярыю гарвыканкама паведамленьне аб мітынгу Дэмакратычнага Блока"Саветы-90" на пляцы Леніна а 14 гадзіне 3 лютага з адпаведнымі спасылкамі на Закон аб выбарах.

30 студзеня гарвыканкам запрасіў прадстаўнікоў БНФ на перагаворы. Высьвятленьне адносін паміж работнікамі выканкама і гаркама партыі, якіх было болып дзесяці, і двума сябрамі Рады адняло столькі часу, што бакі толькі і пасьпелі дамовіцца аб працягу"дыялогу".

30 студзеня пасьля таго, як прадстаўнікі БНФ пакінулі гарвыканкам, там прынялі рашэньне аб правядзеньні мітынгу на стадыёне "Чырвоны Сьцяг" па заяве..."группы избирателей".

2 лютага абласная газета зьмясьціла паведамленьне аб тым, што мітынг праводзіцца па рашэньню выканкама з мэтаю "знакомства с кандидатами в народные депутаты".

Наіўныя сябры Рады БНФ вырашылі, што гэта нейкі іншы мітынг, таму днём 2 лютага патрабавалі ад выканкама тлумачэньняў.

Ім растлумачылі.

У горадзе яшчэ савецкая улада. Мітынг праводзіць гарадская выбарчая камісія. Усе кандыдаты будуць мець магчымасьць выступіць. Аўтар гэтых радкоў наогул атрымае па блату пяць хвілінаў. Ніякага БНФ няма..."Вы не понимаете, что значит "бремя власти".

Далей пайшоў дыялог. Бакі дамовіліся, што старшыня гарвыканкама і аўтар гэтых радкоў каля чатырнаццаці гадзін нягледзячы на ўсё прыйдуць на пляц Леніна, далей у рэпартажы яе называем пунктам збора, каб разам растлумачыць неразумным жыхарам, што чытаюць усялякія "Звароты" акрамя "Гродненской правды", куды перанесены мітынг і каму гэта спатрэбілася. На горад спусціўся змрок...

На наступную раніцу на пункце збора гучала музыка, галосна гучала. Старшыня выканкама у вызначаны тэрмін не знаходзіўся ні на пляцы, ні у кабінеце. К 14 гадзінам сабралася каля 10 тысяч, іх ахоўвалі толькі некалькі афіцэраў міліцыі ды дружына БНФ. Непакой публікі паступова перарастаў у антыпартыйны настрой.

Калі дабраахвотны распаўсюджвальнік газеты БНФ,што надрукавана у тыпаграфіі ЦК КП Эстоніі, атрымаў па зубах ад залішне выслужлівага сяржанта і быў пасаджаны у "Жыгулёнак" другога сяржанта, сталася нешта ўвогуле незразумелае. Сьведка сьцьвярджае, што такімі ён савецкіх людзей ня бачыў, бо з тварамі баксёраў яны абсалютна спакойна гойдалі "Жыгулёнак",шэптам скандзіруючы:"Выпусьці чалавека!"

Аўтар гэтых радкоў узлез да каменных чаразікаў Уладзіміра Ільіча і залементаваў у мегафон:"Цішыня і парадак!"

Гаркамаўскія музыкі пачулі,ды сыгралі "до-мажор", відаць недзе ў нетрах КПСС заела пераключальнік.

Па-дурному спалохаўшыся новага Тбілісі, а раптам людзі пойдуць выключаць музыку, а невядома адкуль возьмецца "сьпецназ" ды кінецца бараніць партыю ад нападкаў,- актывісты з "так называемого БНФ" у пяць хвілін перанесьлі ўвае сьцягі на вуліцу Дзяржынскага, і дзесяць тысяч чалавек чамусьці пайшлі за імі, хоць сьцягі нідзе да гэтага часу не зарэгістраваныя.

Па вуліцах Дзяржынскага і 17 верасьня людзі ішлі спакойна і з годнасьцю, як пасьля зьмены да пустых прылаўкаў.

Але перад зачыненымі і заблакіраванымі варотамі стадыёна"экстрэмісты"не здолелі стрымаць эмоцый. Яны крылі нецэнзурнай лаянкай, пакуль супрацоўнікі міліцыі не знайшлі нарэшце ключ ад замка часоў адміністратыўна-каманднай сістэмы.

Калона БНФ мерным крокам уварвалася на стадыён і нахабна расселася па пустых трыбунах, на якія загадзя былі запрошаны ўсе сумленныя людзі, усё яшчэ давяраючыя партыі.

Аўтар гэтых радкоў клянецца сваім былым піянерскім гальштукам і камсамольскім юнацтвам, што ён ніколі не выкручваў бы рук і не"затыкаў"бы рот апанентам, калі б яму чатыры разы не адключалі мікрафон.

Публіка"разыйшлася"канчаткова, бо якое ж гэта кіно, калі на самым цікавым крыку "экстрэміста" пільна высякалі!

Далей пайшла"так называемая"вострая палеміка, якую па скандалах у Крамлі, на цэнтральным тэлебачаньні ды ВА "Азот" нашы людзі ўжо не ўспрымаюць так сьвежа, як першыя прагулкі М.С.Гарбачова ў народныя масы....

І тут "экстрэміст" Чобат, а ён і зьяўляецца аўтарам гэтых радкоў,- адчуў, што

ягоны сьмеху варты ўплыў на адурманеных нацыяналістычным чадам "тутэйшых" слабее,і прымяніў зусім не партыйны прыём - сказаў праўду пра тое, як чарнавікі праграмы "іхняга" ганьбаванага блока былі не толькі ўкрадзены некім, але па апрацоўцы ідэалагічным аддзелам гаркама КПБ надрукаваны ў "Гродзенскай праўдзе" з адпаведным каментарам.

І да таго ж...

Не чакаючы, пакуль знойдуць раптам згубленага ідэолага Матвеева, які мусіў бы даць адпор нахабным вылазкам, лідэр БНФ груба заявіў, каб "сябры"усталі ды пакінулі стадыён, а праз два тыдні правялі"свой"мітынг...

І няхай дзесяць тысяч запалоханых тэрарыстамі простых людзей паддаліся на правакацыю ды пайшлі не туды і не за тымі, за якімі партыі трэба, але затое 150 сумленных рэвалюцыянераў і будаўнікоў камунізма мужна засталіся на трыбунах і паўгадзіны грызьліся паміж сабой...

Жыве КПСС!

5.02.90



З выступу мэра горада

Если сказать коротко, то идёт самая настоящая борьба за власть... Что это за люди? Вносят они что-либо конкретное, конструктивное, или как мы сегодня ощущаем, на волне перестройки выросли крикуны, демагоги, которые хотят только митингов, не внося ничего конструктивного...( Свіст,крыкі...) Вы же хотели, чтобы я выступил, я выступаю...

Нашу родную многострадальную Беларусь называют застойной и консервативной. Но мы видим, какие процессы происходят в Закавказье, в Прибалтике. Мы видим, как относятся в этих регионах к русскоязычному населению. Сегодня я могу сказать, что около 37 беженцев из Баку...Вы можете представить, что такое беженцы...Это народ уже неуправляемый... Я спрашиваю у вас, кого можно винить в этих вопросах?... и город Гродно никогда не будет удельным княжеством... поскольку есть самая, например, договорная дисциплина между нашими промышленными предприятиями...

З выступленьня рабочага

Так вот, я призываю вас всех, надо, чтобы наши руководители прислушались к нам и как-то нам немножко оставляли тоже. Мы тоже люди. Почему мы должны видеть роги и ноги?...Я предлагаю этих руководителей горисполкома вычёркивать к чертовой бабушке.

З выступленьня:

-Адміністратыўна-гаспадарчы апарат нельга наладзіць,яго трэба паламаць.

Калі далі слова палкоўніку Посахаву, за ім ішлі перапранутыя ў цывільнае целаахоўнікі, у адным зь іх хлопцы пазналі свайго знаёмага з "ткачоўскае" кампаніі - цяпер ужо маёра Воінава, які выставіў ляў іх з Фолюша, а таксама падрыхтаваны салдат, азербайджанец ці можа армянін... які ніводнае фразы да канца не здолеў сказаць.

З выступленьня палкоўніка

Текст по поводу строительства армии выполнен неквалифицированно. У нас -(сьвіст)- вопросы армии не решаются свистками. События в Баку показывают, что свистеть и не слушать друг друга - это очень, очень опасно...

[illegible]ение армии анонимно [illegible]ская информированность заставляет народ обвинять армию во многих проблемах. Я должен вам сказать, что мы требуем, чтобы политические решения по применению армии составлялись законодательными органами, решались полной гласностью народа. И сегодня события в Азербайджане, в которых обвиняют армию, рождены центральными органами и пассивностью, рождены мафией, которая возродилась и существует в Закавказье, и тень падает на тех людей, которые своей грудью кричат восстанавливать мир и спокойствие в Закавказье...Что-то я вот этих крикунов не видел, когда мы тушили 4-й блок реактора..(Крыкі абурэньня.)

Я хотел бы вступить в прямой диалог с БНФ, но посмотрел сегодня, как они тут читают свои бумажки,...рождается страшная бюрократия...

Далей палкоўніка заглушылі

Пасьля яго выступаў якраз той, які быў на страсе завода Гомсельмаш, калі ўзарваўся рэактар, а яго цяжарная жонка загарала на сонеку ў Гомелі...

Адказы на пытаньні, якія задаваліся па кантактнаму тэлефоне:

- Чаму ўся Гарадзенская Рада БНФ - адны жыды?

-На жаль,няма ніводнага прадстаўніка яўрэйскае нацыянальнасьці.Ёсьць беларусы, палякі і рускія...

-Ці праўда, што НФ бярэ закладнікаў,бо дыскрымінуюць ягоных кандыдатаў?

-Брахня і глупства.

-Ці будзе Н Ф высяляць рускіх?

-Брахня і глупства...

-Ці будзе вырэзваць камуністаў?

-Брахня і глупства.

-Ці праўда, што ўсіх прымусяць размаўляць па-беларуску?

-Дай Бог, каб савецкае начальства хаця б сябе прымусіла размаўляць па-беларуску

- Чаму ў вашых зваротах столькі граматычных памылак?

- БНФ карыстаецца Беларускай граматыкай" Браніслава Тарашкевіча, якая ў 1933 годзе была зьліквідавана ў выніку 4-х гадовай кампаніі вынішчэньня беларускае інтэлігенцыі сталінскім рэжымам. Мэта рэформы 1933 года - штучнае набліжэньне беларускае мовы да расейскай і паступовае зьнікненьне яе паводле сталінскае тэорыі зьліцьця нацый...

З выступленьня Уладзіміра Навумовіча - БНФ "Адраджэньне"

...Калі прадаўжаць праводзіць паралелі, давайце правядзем паміж нашай партыяй і камуністычнымі партыямі Усходняй Еўропы, якія пайшлі ў адстаўку, а наша прадаўжае кіраваць грамадзтвам. Улада належыць Саветам, а кіруючай сілай грамадзтва зьяўляецца партыя. Саветы - выходзіць - частка грамадзтва. Значыць, партыя стаіць і над Саветамі. Парткамы думаюць не аб эканамічных пытаньнях, аб ідэалогіі, адсюль вярхавенства ідэалогіі над грамадзтвам, што і прывяло да эканамічнага крызісу.

## АНАЛІЗАТАРЫ АД ГАРКАМА АБО УОТЭРГЕЙТ ПА-ГАРАДЗЕНСКУ

Ідэалагічны адзьдзел гаркама партыі ў выглядзе першай буйнай акцыі 1990 году супраць БНФ і іншых вырашыў украсьці падрыхтоўчыя дакументы Дэмакратычнага блока Саветы-90. Нізкі разьлік будаваўся на тым,што "крыкуны" слабыя на галоўку без чарнавікоў будуць не здольнымі выпрацаваць праграму.

Гаркамаўскія ідэолагі [illegible] так імкнуліся пераканаць людзей у глупотах нефармалаў, што самі ацмачылі глупства, публічна „засьвяціўшыся" ў "Гродненской правде", таму што аналізавалі не канчатковы варыянт дакумента блока Саветы-90, а праграму нейкага Дэмакратычнага руху "Народнае адзінства".

Шэф ідэалагічнага адзьдзела гаркама партыі Матвееў не здолеў адказаць, адкуль у яго зьявіліся чарнавікі, ні на мітынгу, ні на сустрэчы з кандыдатамі ў народныя дэпутаты.

Дарэчы, як заўжды мы пазбаўлены магчымасьці ведаць "аналізатараў" праграмы паімённа. Удалося высьветліць толькі прозьвішчы супрацоўнікаў ідэалагічнага адзьдзела: успомнены Матвееў,а таксама Белы і Баклага.

Між іншым заўважым, што ў цывілізаваных краінах такія фокусы канчаюцца адстаўкай праздадзеенай партыі і ўгалоўнай справай, у нецывілізаванай Расіі рэакцыйныя афіцэры пускалі сабе кулю ў лоб. Мы гэтага бясчынства не дапусьцім,- жывіце,Матвееў з камарыльяй. Слава КПСС!

# Іх падтрымліваюць БНФ „Адраджэньне" і „Саветы-90"

Дадзеныя на I5 лютага

## Гарадскі савет

I. Ватуцінская
БАХАНЕВІЧ
2. Віленская
УШКЕВІЧ, МАЛІНОЎСКАЯ
4. Катоўская
ТАРАКАНАЎ і ПЯТКЕВІЧ
7. Фестывальная
КВІТ
I0. Болдзінская другая
СМАГРЫН
II. Болдзінская трэцяя
БУДЗЬКО
I3. Заходняя першая
РУНГЕ
I4. Заходняя другая
НАВУМОВІЧ, ЛЯВПА
I7. Заходняя пятая
ВОРАН
I8. Паўночная першая
ЯФРЭМАЎ
20. Ленінская другая
ГУСАРАЎ
25. Маладзёжная трэцяя
ЗЕЛЬНІНАЎ
27. Маладзёжная пятая
[illegible]ЕШКА
28. Ленінская пятая
[illegible]РОЎСКІ А.А.
2[illegible]. Ленінская шостая
УСАЎ А.А.
37. Грандзіцкая першая
ГАРКОЎ А.
38. Грандзіцкая другая
ГРЖЫШКЕВІЧ
4I. Грандзіцкая пятая
ГРЫНЦІНА
42. Чарнахоўская
ЧОБАТ
44. Студэнцкая
ЯНУЧОК
45. Таўлайская
ПАТАПЧЫК
47. Дзевятоўская першая
ФРАНКОЎСКІ
52. Дзевятоўская другая
БАРАНОЎСКІ
54. Дзевятоўская чацьвёртая
ПАЛТАВЕЦ
55. Студэнцкая трэцяя
МАЦКО
56. Паўлеўская
СЫЦЛУРА
57. Тэлеграфная
СІЦЬКО
59. Замкавая
БІЧЭЛЬ-ЗАГНЕТАВА
63. Пралетарская другая
ПЕЛЮСАР
65. Усходняя
ПЯХОЎСКІ
66. Заслонаўская
МІШАР і БУГАР
68. Лідская першая
КАРНЕВІЧ
69. Белушаўская першая
ЧЫЧАГАЎ
70. Белушаўская другая
КАНЧАНІН
7I. Лідская другая
КАРЛ
73. Краснапартызанская
АЛЬШЭЎСКІ
75. Гагарынская другая
РАМАНОВІЧ
77. Кааператыўная другая
БАЎБЛЕЙ
80. Пагранічная
БЕРТЭЛЬ
8I. Соламаўская першая
КАКАРЭКА
82. Соламаўская другая
МАКУШКІН
92. Рэпінская трэцяя
ГІВОЙНА
93. Чайкоўская трэцяя
ІГНАЦЕНКА
94. Сонечная
ЯГОРАЎ і ЛАЗОЎСКІ
97. Купалаўская
АНДРЭЕЎ
98. Някрасаўская
МАСКАЛЁЎ
I03. Славінская першая
БЫЛЬ, ПАРНІКАЎ
I05. Томінская
ПАЛУБОК ІОСІФ
I06. Пабеданосная першая
ШВЫРКІН
II0. Прынёманская першая
ЖУРАЎ
III. Прынёманская другая
ДЗЬМІТРЫЕЎ
II6. Юбілейная трэцяя
ДАЛГОЎСКІ
II7. Прынёманская пятая
РАЎБЕЦКАЯ
I22. Цэнтральная першая
ДАБКУС

## Абласны савет

I. Горкаўская
ЯКУШАЎ
5. Дамброўская
МАЙСІЕНАК
I0. Школьная
ЛУКАШЫК
II. Студэнцкая
ТАРАКАНАЎ
I2. Камсамольская
КУЛЯЕЎ
I3. Пушкінская
МАЛЕВІЧ
I4. Раймантаўская
ДОЛАБ
I7. Ліможская
СЕРБІН
I9. Сацыялістычная
САМОЙЛА
2I. Савецкая
КУСЬЦІКАЎ
24. Чыгуначная
Ліона В.А.
27. Гагарынская
КАРАЎКА
32. Заходняя
БРЫНКЕВІЧ
КУЗЬНЯЦОЎ
33. Аўгустоўская
СКРАБОЦКІ
34. Ганіёнская
КУБАСАЎ
39. Пераможная
ЗАКРЭЎСКІ
ПАСІКАЎ
40. Юбілейная
АНІШЧЫК
4I. Кастрычніцкая
ПАРФЁНЕНКА
3. Спартыўная
ВІЛЬЧЭЎСКІ
8. Калінаўская
ХЛАМКО
I4. Дамброўская другая
ПЯТРЭНКА

## Раённыя саветы

39. Даватарская
СТАЛЬБОЎСКІ
55. Будзёнаўская
ЯКУШАЎ
5. Шчорсаўская
ВАСІЛЬЕЎ
9. Мемарыяльная
РАМАНОЎСКІ
I0. Азотаўская
ГРЫНЧАНКА
I2. Антонаўская
ЯКІМЧЫК
I5. Гогалеўская
СКАЧКОЎ
I6. Студэнцкая
КАРПОВІЧ
20. Рачная
ЗАПОЛЬСКІ
35. Лелевельская
МЫШКО

## кандыдатаў ў
## Народныя дэпутаты БССР

238. Горкаўская
СОРКІН
239. Дзяржынская
МІЛЕЙКЕВІЧ
240. Пралетарская
ЛЯВПА
24I. Прынёманская
МАРКЕВІЧ

Калі дайшло да мардабою, усе прынцыповыя пасунуліся ў незалежныя.
Алесь Чобат